Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 34 (533). Вільня, Нядзеля 8 Кастрычніка 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская
КРЫНІЦА
Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Завальная вул. 1-1. (Wilno, ul. Zawalna 1-1).
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў і Беларусы.

Двацаты век, у якім нам давялося жыць, гэта між іншым век буйнага разьвіцьця нацыянальнасьцяў. Цяпер бадай кожны народ на сьвеце, а прадусім у Эўропе, ужо сьведамы сваей нацыянальнай асобнасьці, або прынамсь сьведамасьць гэту ў сабе разьвівае і імкнецца да самастойнага жыцьця ў граніцах сваей этнографічнай тэрыторыі, творачы адначасна сваю нацыянальную культуру.

Вэрсальскі трактат, кроячы граніцы новых дзяржаў, пасьля сусьветнай вайны прынцып нацыянальнасьці, праўда, браў пад увагу, але столькі, „колькі трэба" было. Дзеля гэтага ў дзяржавах паваеннай Эўропы галасна пачалі дабівацца сваіх нацыянальных правоў розныя народы, якія, часта парэзаныя новымі граніцамі на часткі, апынуліся ў розных дзяржавах, як нацыянальныя меншасьці.

Праўда, аб нацыянальных правах гэных меншасьцяў Вэрсальскі трактат падумаў і правы гэныя загварантаваў асобнымі пунктамі. Але ў практыцы нічога добрага для меншасьцяў з гэтага ня вышла, бо многія паваенныя дзяржавы адносна меншасьцяў не спаўняюць ня толькі Вэрсальскага трактату, але нават і ўласнай конституцыі.

Вось-жа нічога дзіўнага, што пакрыўджаныя пануючымі над сабой дзяржавамі нацыянальныя меншасьці аб правох сваіх нацыянальных пачалі клапаціцца самі. Дзеля гэтай мэты, ад 1925 г. пачалі адбывацца Кангрэсы прадстаўнікоў нацыянальных меншасьцяў Эўропы. Адбываюцца яны пераважна ў Жэнэве, толькі леташні адбыўся ў Вене, а сёлетні ў Бэрне. Кангрэсы гэтыя маюць свой пастаянны выканаўчы орган, якім зьяўляецца Сэкрэтарыят, што прабывае ў Вене.

Усіх нацыянальных меншасьцяў у Эўропе, апрача СССР, налічваецца больш 30-ці мільёнаў, якія знаходзяцца ў 14 дзяржавах і зьяўляюцца асобнымі групамі, лікам да 40 нацыянальнасьцяў. З усіх гэных некалькіх дзесяткоў мільёнаў нацыянальных меншасьцяў да Кангрэсу належаць 82 прац., а ў гэтым ліку і беларусы.

Значэньне для нас беларусаў гэных Кангрэсаў важнае. Гэта для нас бадай адзіная магчымасьць, як кажуць, „і сябе паказаць і на людзей паглядзець". Сьвет аб нас дужа мала, а часта і нічога ня знае і ня ведае, а гэта — рэч ясная — толькі разьвязвае адносна нас рукі тым, у чыіх руках мы сяньня знаходзімся; а што гэныя рукі даволі шорсткія, дык і гаварыць ня прыходзіцца.

На Кангрэсах-жа абгаварваюцца правы ўсіх нацыянальных меншасьцяў і ўсім зацікаўленым дзяржавам прыпамінаецца абавязак не ламаць іх, але аберагаць. Гэткі абавязак прыпамінаецца каму трэба на Кангрэсах і адносна беларусаў.

Спатыкаюцца там між сабой прадстаўнікі розных нацыянальных меншасьцяў, пазнаюцца, дзеляцца думкамі аб сваей бядзе, снуюць пляны здабыцьця супольнымі сіламі сваіх правоў і дадаюць адны-адным ахвоты да барацьбы за свае правы. З моральнага гэтага падтрыманьня, як учасьнікі Кангрэсаў, карыстаюцца і беларусы.

На Кангрэсах бываюць звычайна карэспандэнты ад розных газэт бадай з усіх дзяржаў Эўропы, зорка сьлядзяць за нарадамі і аб усім даносяць у свае газэты, якія весткі гэтыя аб розных народах,— што сяньня завуцца меншасьцямі, а з якіх многія на сваей тэрыторыі складаюць большасьць і імкнуцца да сваей нацыянальнай самабытнасьці — разносяць па ўсім сьвеце. Так напр. прамову беларускага прадстаўніка на сёлетнім IX Кангрэсе 16—19.IX і агулам паданыя заграгранічным карэспандэнтам весткі аб Беларусі і беларускім народзе, разьнесьлі па сьвеце швайцарскія газэты.

Урэшце трэба ведаць, што гэныя Кангрэсы, праз свой выканаўчы орган, усе свае нарады, выступленьні дэлегатаў і пастановы друкуюць і гэтым так-жа знаёмяць з рознымі нацыянальнымі меншасьцямі ўвесь сьвет. Апрача таго, той-жа выканаўчы орган Кангрэсаў друкуе ў заграгранічных мовах цэлыя кніжкі аб гэных нарадах агулам і аб іх палажэньні ў розных дзяржавах. Так напр. у кнігах: „Die Nationalitäten in den Staaten Europas" і ў „Statistisches Handbuch der europäischen Nationalitäten", выданых у 1931 г. стараньнем Сэкрэтарыяту Кангрэсаў, сьвет нямала даведаецца і аб беларусах і аб іх крыўдах.

Словам, Кангрэсы Нацыянальных Меншасьцяў для беларусаў маюць значэньне вялікае і дзеля гэтага, помнячы заўсёды праўду, што ў еднасьці сіла, трэба нам на іх бываць і адпаведна іх выкарыставаць для беларускага нацыянальнага вызваленьня.

Нябывалы паход супроць беларускае мовы.

Ад дня 15 верасьня сёлета ў Савецкай Беларусі абавязывае новы правапіс, устаноўлены Саветам Народных Камісараў БССР дня 28.VIII.33. і абвешчаны ў Менскай „Зьвязьдзе" таго-ж дня, у нумары 189. Хаця гаворыцца там аб рэформе правапісу, на дзеле ёсьць гэта рэформа ня толькі правапісу, але беларускае мовы наагул. Рэформа гэта ёсьць далейшым актам у паходзе маскоўскага нацыяналізму супроць беларускае культуры ў БССР, актам найбольш агідным і цынічным у сваіх падставах, бо скіраваным супроць найвялікшае азнакі нашае самабытнасьці — мовы. Рэформа абымае аж 27 языковых асаблівасьцяў, але дзеля нястачы месца, падаём тутака толькі найбольш характэрыстычныя. Паводле гэтае рэформы пастаноўлена:

1. Выкінуць мягкі знак паміж мягкімі зычнымі і замест дасюлешняга **сьвет, сьнег, сьлед, дзьверы, цьвёрды,** —пастаноўлена пісаць: **свет, снег, след, зняць, дзверы, цвёрды,** зусім таксама, як і ў расейскай мове.

2. Таксама выкінуць мягкі знак паміж групамі падвойных зычных (**насенне, галлё, калоссе, жыццё,** замест дасюлешняга — **насеньне** і т. п.). Падвойнае **„дз"** пастаноўлена перадаваць праз **„ддз"** (замест **„судзьдзя,"**— пісаць **„суддзя"**).

3. У злучэньнях каранного **„д"** з гукам **„с"** паступаючых суфіксаў нязьменна захаваць **„с"**, як і ў расейскай мове (**гарадскі, грамадскі,** замест дасюлешніх — **гарадзкі, грамадзкі**).

4. Зычныя **„г," „ж", „з", „х", „ш"** у географічных назовах ня зьліваць з суфіксальным **„с,"** прычым **„г," „к", „х"** у большасьці выпадкаў зьмяняць на **„ж", „ш"** (**Волжскі, Каўказскі, варонежскі, чэшскі, чувашскі**).

5. Інтэрнацыянальныя рэволюцыйныя словы не падпарадкоўваць агульнаму правілу аб аканьні.Пісаць: **рэволюцыя, совет, большэвік.** У іншых чужых словах **„о"** перадаваць праз **„а"**, але захаваць, як і ў расейскай мове, **„е"** мягкае: **прафесар, Універсітет, педагог.**

6. Чужыя словы з **„л"** перадаваць на беларускім пісьме згодна з традыцыйным, пашыраным на БССР вымаўленьнем,г. зн. пераважна цьвёрда: **метал, бензол, алмаз, балкон, бланк, клас, дыплом, клуб.** – Ад сябе зазначым, што вышупомненыя словы ў беларускай мове ўжываюцца толькі з **„ль"** мягкім Ужываньне тут **„л"** цьвёрдага ёсьць адным русыцызмам.

7. У запазычаных словах пасьля **„с":„з"** заўсёды пісаць **„і"**, а ня **„ы"**, як гэтага вымагае беларуская мова: **марксізм, фізіка, сістэма.**

8. Запазычанае **„th"** перадаваць праз **„ф"** **арыфметыка, лагарыфм, міф, кафедра.**

9. Чужое **„ф"**, наперакор агульным тэндэнцыям беларускае мовы, пастаноўлена перадаваць праз ф: **форма, фунт, фабрыка.**

10. Словы небеларускага паходжаньня, як **„пролетарый", „алюміній"** і пад. пісаць з канчаткамі расейскімі **„—ый", —ій"** і скланяць як назоўнікі тыпу **„май."**

12. Назоўнікі мужчынскага роду ў родным склоне адз. ліку пісаць з канчаткамі **„—а," „—я"** так, як у расейскай мове: **завода, цэха, інстытута, социялізма, універсітэта** і г. п.

12. Беларускія канчаткі давальнага і меснага склонаў назоўнікаў муж. і ніяк. роду множ. ліку **„—ом," „—ох,"** замяніць расейскімі канчаткамі **„—ам," „—ах":** **кіраўнікам, аб кіраўніках, братам, аб братах,** замест: **кіраўніком, аб кіраўніках, братом аб братох.**

Вось важнейшыя зьмены, праведзеныя бальшавіцкімі ўладамі ў галіне беларускае мовы. Як бачым, над беларускай моваю робяцца там недапушчальныя экспэрымэнты. Усе навасьці, уведзеныя ў беларускую мову, узятыя беспасярэдна з мовы расейскай. Адсюль мэта рэформы вельмі ясная: — **бальшавікі хочуць цалком зрусыфікаваць беларускую мову, зацёрці ўсе яе індывідуальныя асаблівасьці.** З гэтым ня скрываюцца і ініцыятары ўспомненай рэформы. Бо вось у „Зьвязьдзе" з дня 1.IX.33г. віцэ-старшыня Беларускай Акадэміі Навук Г.Домбаль (палякі) высьвяе, што рэформа мае на мэце ачысьціць беларускую мову ад скажэньняў, уведзеных беларускімі нацыянал-дэмакратамі, якія між іншым „стараліся стварыць штучную бар'еру паміж беларускай і расейскай мовамі, шляхам выняцьця з беларускае мовы рускіх элемэнтаў."

Ад палавіны верасьня ў Савецкай Беларусі ўсе друкі выходзяць ужо не ў беларускай мове, але ў беларуска-расейскім, штучна створаным жаргоне.Але гэта яшчэ не канец. Успомненая рэформа ёсьць толькі першым крокам у прымусовым русыфікаваньні беларускае мовы. Параграф 29 пастановы Савету Народных Камісараў БССР. аб рэформе правапісу гаворыць наступнае: „Даручыць Народнаму Камісару Асьветы і Прэзыдыюму Беларускай Акадэміі Навук арганізаваць сыстэматычную навуковую работу па далейшым разьвіцьці і ўпарадкаваньні беларускага правапісу, усей граматыкі і тэрміналёгіі, таксама арганізаваць новае выданьне беларуска-расейскіх слоўнікаў, выпраўляючы з беларускае мовы ўсялякія буржуазна-нацыяналістычныя тыпы і скажэньні."

Адсюль вынікае, што маскоўскія нацыяналісты на становішчах Камісараў БССР. імкнуцца да поўнага зьліквідаваньня беларускае мовы. Мэта іх ясная і беларускаму народу вельмі добра знаная на працягу некалькіх вякоў.Толькі ў дэнацыяналізаваньні беларускага народу маем тут новыя спосабы, — больш нізкія, цынічныя, подлыя... Беларусом у Савецкай Беларусі прызнаецца культурная аўтаномія і ўжываньне беларускае мовы, толькі нажаль беларускай афіцыяльна, а фактычна—штучна створанага і накінутага прымусова беларуска-расейскага жаргону.

С. К.

Рэзалюцыі Праваслаўнай Камісіі Бел. Нац. К-ту ў Вільні

прынятыя на паседжаньні Камісіі дня 4.X.1933 г.

„Беларускі Нацыянальны Камітэт, як зароўна і ўсё беларускае царкоўнае грамадзянства, на працягу некалькіх апошніх гадоў зьвярталіся да Выш. Дух. Уладаў з просьбай аздараўленьня анармальнага становішча Прав. Царквы ў Зах. Беларусі, якое вытварылася дзякуючы ўводжаньню ў Царкву палітычнае акцыі маскоўскага вялікадзяржаўніцтва. Выш. Дух. Улада, ня гледзячы на гэныя просьбы, свайго становішча дагэтуль не зьмяніла. Найбольш істотныя і прынцыповыя дамаганьні беларускага народу не здаволены, акцыя маскоўскага шавінізму вядзецца пры помачы царквы і на далей. Расейская мова ўсьцяж яшчэ пануе ў пропаведзі, у школе і ў Кансысторыі. Адзіная на нашых землях Дух. Сэмінарыя ў Вільні ўсьцяж яшчэ зьяўляецпа школай узгадоўваючай ворагаў беларускага Народу. Становішчы місыянэраў і на далей выкарыстоўваюцца дзеля пашыраньня ненавісных народу ідэалаў маскоўскага вялікадзяржаўніцтва, дзеля прапаганды варожых адносінаў да Сабору і яго скліканьня. Да сяньня беларускі Народ ня мае сваей рэлігійнай літэратуры і часопісу, хоць-жа грошы беларускай вёскі плывуць у Мітраполію бязупынна, дзе ідуць на запамогі маскоўскім „Словам,, абражаючым рэлігійныя і нацыянальныя пачуцьці праваслаўнага беларуса. Да сяньня не ўпарадкавана справа Дух. Кансысторыяў і Кіраўніцтва Віл. Эпархіі, дзякуючы чаму ўвесь кіраўнічы апарат знаходзіцца ў руках людзей, якія выкарыстоўваюць яго дзеля мэтаў асабістых ды варожых інтэрэсам Царквы і Народу. Да гэтага часу не вядзецца ніякае падгатаваўчае працы над усьведамленьнем народу ў кірунку яго ўдзельніцтва ў маючымся адбыцца Саборы.

Усё вышэй пералічанае паглыбляе заняпад рэлігійнае і моральнае сьведамасьці ў Народзе, з чаго скваплíва карыстаюцца ворагі Прав. Царквы і Хрысьціянства наагул.

Бяручы пад увагу вышэйсказанае, Праваслаўная Камісія Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні дамагаецца:

1. Пакліканьня ў Кансысторыі і Эпарх. Кіраўніцтвы наагул людзей кроўна зьвязаных з беларускім народам, адданых яго Царкве.
2. Пакліканьня на становішчы місыянэраў духаўнікоў беларусоў, якія мелі-бы на ўвеце дабро Царквы, а не асяганьне палітычных мэтаў, варожых Царкве і Народу.
3. Увядзеньня беларускае мовы пры навучаньні рэлігіі ў школе, у Царкве і Кансысторыях, адносячыся да гэтага шчыра, а ня спосабамі, якія практыкуюцца дагэтуль.
4. Спыніць маскаўленьне гадунцоў Дух. Сэмінарыі ў Вільні.
5. Прыступленьня да выдаваньня рэлігійнае літэратуры і сталае рэлігійнае часопісі ў мове беларускай, з адначасным прыгатаваньнем народных гушчаў да ўдзельніцтва ў саборнай перабудове нашае Царквы.
6. Запыненьня гвалтаў і абражаньня беларускага рэлігійнага і нацыянальнага пачуцьця ўсялякімі варожымі выступленьнямі (як інцыдэнт 25.III.33 г.) ды безадказнымі вызначэньнямі да нас людзей (як прат. Рагальскія і прат. Пратасэвічы ды інш.), ня скрываючых сваёй варожасьці да беларускага Народу.
7. Нязмушаньня беларускага грамадзянства да выступленьняў больш актыўных, што можа мець месца пры далейшым ігнараваньні просьбаў беларускага Народу.

Праваслаўная Камісія Бел Нац. К-ту.

Пачаеўская дэманстрацыя.

У палове сёл. году па ўсёй Польшчы мелі адбыцца ўрачыстыя сьвяткаваньні ўгодкаў архіпастырскага служэньня Мітр. Дзяніса. Расейскія эмігранты, на чале з рознымі князькамі ды графамі, сьвяткаваньні гэныя пастараліся выкарыстаць дзеля заманіфэставаньня сваіх маскоўскіх пачуцьцяў, якія намагаліся накінуць украінцам і беларусом. Дзеля гэтага апошнія ад такіх сьвяткаваньняў адмовіліся. Асабліва востра ўсё гэта выявілася на сьвяткаваньні, якое адбывалася ў Варшаве. Там ані беларусы, ані ўкраінцы ўдзелу ня бралі. Затое маскоўская цынічная „разухабістасць“ дайшла ўжо да таго, што нават палякі і тыя мелі ўражаньне, быццам Варшава ўзноў знайшлася пад ботам царскага казака. Цікава, што хоць яшчэ нядаўна палякі і фаворызавалі эміграншчыну, каб гэтакім чынам супроцьставіцца ўкраінцам і беларусом, то аднак пачуўшы дух гэтых „юбілеяў“ забілі на трывогу. Здавалася, што Мітр. Дзяніс на будучыню ўжо гэткіх экспэрымэнтаў не дазволіць ладзіць, тым больш, што яны закраналі і дыскрэдытавалі ня толькі самога Мітр. Дзяніса, але і Царкву. На жаль, гэныя „сьвяткаваньні юбілееў,“ закончыўшыся фармальна скандалам, нічога Мітр. Дзяніса і яго князёўскую дварню не навучылі.

На дзень 10 верасьня па нов. стылю прыпадае вялікае сьвята ў Пачаеўскай Лаўры на Валыні, у якім зазвычай бярэ ўдзел ня толькі насельніцтва Валыні, але і іншых краёў. Вось-жа расейская эміграншчына і князькі, як заўсёды рухлівыя і спрытныя, задумалі раз няўдаўшыся экспэрымэнт паўтарыць яшчэ і якраз у дзень 10 верасьня ў Пачаеўскай Лаўры, калі там зьбіраюцца дзесяткі тысячаў верных. Думалася гэтым панком, што ў гэтакім натоўпе народу іх махінацыі пройдуць лёгка — назьбіраюцца ад абдурманеных грамадаў подпісы, а пасьля раструбіцца на ўвесь сьвет, што народныя стыхіі віталі «юбілей» Мітр. Дзяніса і князёўскай рэакцыі. Аднак і тут экспэрымэнт гэты закончыўся скандалам і то яшчэ большым.

На маскоўскую дэманстрацыю расавага хіжацтва ўкраінскі народ адказаў стыхійным пратэстам. З нетраў сабраных народных гушчаў былі разьвернуты дзесяткі нацыянальных украінскіх сьцягоў ды гэтулькі-ж транспарэнтаў з надпісамі: „досыць маскоўскага палітыканства ў Прав. Царкве!“ „проч з русыфікацыяй ў Прав. Царкве!“ „проч з маскоўскімі місыянэрамі ў нашай Царкве!» „не патрабуем чужой іерархіі!“ „за змацаваньне прадзедаўскай веры!“ і г. д... Адзінага архіпастыра-ўкраінца, епіскапа Палікарпа, народ вітаў, схінаючы перад ім усе гэныя сьцягі, грымотнымі воклікамі „слава!“, у той час як маскоўскай эміграншчыне крычэў „гэть!“ (проч!). У хуткім часе пасьля гэтага адбылося вялічэзнае веча, на якім народ злажыў прысягу на вернасьць Царкве і выслаў сваіх дэлегатаў да Мітр. Дзяніса, ад імя якога дэлегацыю прынялі Архіеп. Аляксей і Еп. Палікарп, прыняўшы ад яе рэзалюцыі веча.

Пачаеўская дэманстрацыя адбілася голасным рэхам далёка паза межамі Валыні.

Маскоўская прэса (эміграннская і мітрапалітальная) з пенай на вуснах сіліцца даказаць, што гэная сапраўды дэманстрацыя стыхіі народнай была штучнай, антыцаркоўнай, называючы яе ўдзельнікаў: „дзікая галота,“ «гурток наемнікаў,“ „парабкі,“ „хуліганы,“ «антыцаркоўнікі“ і г. д. Гэтак акрэсьліваючы дэманстрантаў, мітрапалітальная(!) прэса мае адвагу прытым-жа гаварыць, што дэлегацыя ад гэтай „антыцаркоўнай галоты і хуліганаў“ была прынята ад імя Мітр. Дзяніса архіеп. Аляксеем і еп. Палікарпам. **Гэтых „хуліганаў“ Мітр. Дзяніс быў змушаны багаславіць,** убачыўшы іх сьцягі — сказаць: „як мне прыемна гэта бачыць.“ Гэтая-ж прэса лік дэманстрантаў акрэсьлівае раз у 300 чалавек, то ўзноў у 3.000, каб праз некалькі радкоў ніжэй цьвердзіць, што гэта была толькі „жменька“ хуліганаў, у той час як дваццацьтысячная грамада, быццам верная іерахіі, ня толькі ня выступіла супроць гэнай «жменькі“ хуліганаў, але сама прыняла дзейны ўдзел у гэнай спонтаннай дэманстрацыі супроць маскоўскага хіжацтва. Як бачым, іерархія наша на гэным экспэрымэнце ня толькі ўжо аскандалілася, але папросту зайшла ў тупік.

Мы, беларусы, да гэнае дэманстрацыі ўсёцэла далучаемся, усёцэла з ёй салідарызуемся! Мы ведаем, што Царква ня ёсьць месцам дэманстрацыяў, што яны на гэтым ўлоньні шкодны для царквы. Аднак, калі нашы іерархі дазваляюць на гэта маскоўцам і самі ў Царкву ўводзяць дэманстрацыі і палітыканства, нясучы праз Царкву сьмерць украінцам і беларусом, то і гэтыя апошнія ў праве бараніцца, ладзіць падобныя дэманстрацыі, тымбольш што **нашы дэманстрацыі гэта толькі пратэст супроць пагвалчаньня нашых пачуцьцяў рэлігійных і нацыянальных, супроць раскладу Царквы.**

Падобна як украінскі народ і мы, беларусы, ніколі не пагодзімся, каб Царква служыла да маскоўленьня і разьбіваньня нашага народу, каб маскалі былі епіскапамі на нашых землях, каб расейскія місыянэры разьяжджаючы заклікалі да барацьбы за „єдіную неделімую“, да захаваньня ў Царкве «русского духа». **На гэныя гвалты і народ беларускі будзе змушаны адказываць пратэстам, пратэстам ў Царкве.** Пачаеўская дэманстрацыя паказала ўсім, як трэба змагаць апэтыты маскоўскага хіжацтва. **Лявон Хмурны.**

З беларускага жыцьця.

Агульны Сход Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні. Дня 29 м. м. адбыўся чарговы Агульны Сход Бел. Нац. К-ту, на якім прадстаўнік ад Беларусаў пад Польшчай на сёлетні IX Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў у Бэрне Швайцарскім інж. А. Клімовіч даў справаздачу аб ходзе гэтага Кангрэсу і свеей на ім дзейнасьці. Сход К-ту справаздачу прыняў да ведама і выразіў пажаданьне большага зацікаўленьня беларускай акцыяй на грунце міжнародным.

Паседжаньне Праваслаўнай Камісіі Бел. Нац. К-ту. Дня 4 г. м. адбылася нарада Праваслаўнай Камісіі Бел. Нац. К-ту ў справе царкоўнай. Камісія між іншымі справамі прыняла рэзалюцыю, якую друкуем побач.

Незацьверджаньне і „завешваньне“ гурткоў Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. У верасьні м-цы 1931 г. заснаваўся гурток Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры ў в. Гайніне, Баранавіцкага пав. Баранавіцкае старастава пісьмом з дн. 29.IX.31 № 4411/В.Р. паведаміла, што ня прыймае да ведама заснаваньне гуртка Інстыту ў Гайніне. Цэнтраля Інстытуту падала тады скаргу ў Наваградзкае ваяводзтва. Пачакаўшы паўгоду Цэнтраля Інстытуту зьвярнулася ў Міністэрства Унутр. Спраў і апошнімі днямі толькі атрымала пісьмо з дн. 12.IX.1933 г. N.B.P. 51(2)2), у якім Баранавіцкае староства паведамляе, што Наваградзкі ваявода загадаў зарэестраваць гурток Інстытуту ў Гайніне. Такім парадкам гурток ў Гайніне легалізаваўся два гады.—Ці-ж пры гэткіх умовах працы можна гаварыць аб падняцьці культуры і хто ёсьць адказным за цемру нашай беларускай вёскі?

У в. Babakомшчыне, Наваградзкага пав. існаваў залегалізаваны гурток Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры ад 1927 г. Цэнтраля туды ў свой час выслала кніжок, дзе адчынілася афіцыяльна бібліятэка-чытальня. Сёлета Наваградзкае староства пісьмом з дня 28.VIII.1933 г. паведаміла гэты гурток, што на падставе законаў дзейнасьць гуртка Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры ў Babakомшчыне „завешваецца“ за ягоную бяздзейнасьць.—І выходзіць так, што зачынілася дзейнасьць за... бяздзейнасьць.

Сёлета ў верасьні м-цы заснаваўся гурток Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры ў в. Вялікая-Быхаўшчына, Нясьвіскага пав. Дня 3.IX 1933 г. падана ў староства адпаведнае паведамленьне. Гэта староства ўзноў пісьмом з дня 20.IX.1933 N.B.P./12,/3 паведаміла закладчыкаў гуртка, што ня прыймае да ведама паведамленьня аб заснаваньні гуртка Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры ў Вялікай-Быхаўшчыне, інакш кажучы, староства і тут гуртка не залегалізавала. Закладчыкі падалі скаргу ў Наваградзкае ваяводзтва.

БЕЛАРУСЫ Ў ЧЭХАСЛАВАЧЧЫНЕ.

(*Ад уласнага карэспандэнта*).

Другая выстаўка славянскіх часопісяў у Празе адчынілася 23 верасьня і трывае да 7 кастрычніка. Пасьля гэта-ж выстаўка будзе перавезена ў Бэрн на Мораве. На выстаўцы знаходзіцца і беларускі аддзел пад уласным бел-чырвона-белым сьцягам. У аддзеле зьмешчаны паказныя нумары ўсіх беларускіх часопісяў.

З ГАЗЭТ.

Што бачыў Эріо ў С.С.Р.Р.

Нядаўна француская палітыка пасылала б. міністра Францыі Эріо ў С.С.Р.Р., каб пасунуць туды за Эріо і свае ўплывы. У гэтай паездцы крыецца вялікі палітычны інтэрас Францыі, дык скарысталі з гэтага дзеля замыленьня вачэй сьвету прад сапраўднасьцяй у Саветах і бальшавікі. Эріо, рэч зразумелая, езьдзіў у Расею не па тое, каб даведацца, што там дзеецца, а толькі дзеля таго, каб наладзіць нейкую сувязь Францыі з Саветамі, дык што яму камуністы паказвалі, усё хваліў і дзівіўся. А паказалі камуністы адзін толькі бок савецкага жыцьця і то ня штодзеннага, а сьвяточнага.

Аб гэтых дасягненьнях Саветаў, якія бачыў Эріо, загранічныя газэты, дастаўшы інфармацыі з дыплёматычных там кругоў, пішуць гэтак:

Прад прыездам Эріо ў С.С.Р.Р. адбылася ў Маскве спэцыяльная конфэрэнцыя з учасьцем галавароў Г.П.У. Менжынскага і Ягоды. На гэтай конфэрэнцыі выпрацаваны быў плян цэрэмоніі падарожы Эріо па Саветах, а так-жа ўплянавана, каб нікога не дапусьціць да Эріо і перашкодзіць у перадачы яму пісьмаў.

У кожнай фабрыцы, якую — паводле пляну Г.П.У. — меў аглядаць Эріо былі выбраны найлепшыя камуністы, якія цэлымі днямі вучыліся напамяць прамоваў і эвэнтуальных адказаў на пытаньні францускага гасьця. Няпэўных работнікаў на той час павыганялі з фабрыкі, баючыся, каб яны не ўцялі якой штукі, ды не сказалі праўды, якая папсавала-б добры настрой. Работнікі, а нават і дырэктары тых фабрык, якія меў аглядаць Эріо, атрымалі спэцыяльна пашытую новую вопратку (якую пасьля пэўне-ж адабралі). Апрача гэтага ўсе дарогі, якімі езьдзіў Эріо, ачысьцілі ад „безпризорных" дзяцей, жабракоў і абдзёртых работнікаў.

У прыбочнай стражы Эріо акружалі выбраныя і выспэцыялізаваныя агенты Г.П.У. пад камандай нейкага Чорбы. Апрача гэтага на пошце быў зарганізаваны спэцыяльны „чорны кабінэт", які кантралёваў карэспандэнцыю з заграніцы і краёвую, каб не папалі да Эріо пісьмы, нялюбага бальшавіком зьместу.

Вось як „аглядаў" Эріо камуністычныя дасягненьні ў С.С.Р.Р.: бачыў, што яму паказалі самі камуністы, схаваўшы голад, абдзёртасьць і бяднацтва.

Аб польска-савецкім зьбліжэньні.

Нямецкія газэты пішуць, што зьбліжэньне Польшчы з С.С.Р.Р. зьяўляецца толькі выяўленьнем таго, што інтарэсы Францыі ў усх. Эўропе сконцэнтраваліся цяпер ня ў Польшчы, а ў Чэхаславаччыне. Польшч, чуючыся безбароннай супроць „нямецкай інвазіі на Памор'і, зьмяніла сваю арыентацыю на ўсход і шукае прыязьні з С.С.Р.Р. Аднак гэта польска-савецкая прыязьнь ёсьць пад знакам пытаньня, бо націск з усходу ня ёсьць для Польшчы так грозны, як грозны ўплыў бальшавізму на польскае грамадзянства.

З царкоўнага жыцьця.

Паводле вестак украінскае і расейскае прэсы, у Варшаве адбылося прыняцьце ў манашаства прат. Пратасэвіча, які затым быў узьведзены ў сан архімандрыта. Новавысьвячаны архімандрыт, паводле тых-жа вестак, мае быццам атрымаць пасад вікарнага епіскапа ў Віл. Эпархіі. Калі гэтыя весткі адпавядаюць праўдзе, то нашыя Дух. Улады зробяць яшчэ адзін неразважны крок, які можа пацягнуць за сабой новыя выступленьні на ўлоньні Царквы. Справа ў тым, што нова-высьвечаны архімандрыт добра ведамы з сваіх варожых адносінаў да беларусаў, а таму гэтыя на прыняцьце яго ў Вільню ніякім чынам не пагодзяцца.

Ужо хутка выйдзе з друку і паступе ў прадажу БЕЛАРУСКІ АДРЫЎНЫ КАЛЕНДАР на 1934 год.—Мае ён два стылі: новы (каталіцкі лацінкай) і стары (праваслаўны—кірыліцай), а так-жа многа рожнароднага і цікавага матэрыялу. Каштавацьб будзе ён усяго каля 60 грошаў.

З Польшчы.

Працэсы за палітычныя забойствы. У канцы мін. м-ца адбыўся ў Польшчы цікавы палітычны працэс, які адбіўся голасным рэхам на бачынах польскай прэсы. Судзілі Р. Яйко — урадаўца Комунальнай Касы Ашчаднасьці, С. Станкевіча — агента паліцыі і каманданта пав. паліцыі Б. Дрэвінскага.

З гэтых трох Яйко абвінавачаны за забойства эндэцкага дзеяча маёра Овоца (Аб гэтым нападзе і забойстве мы ў свой час падавалі ў „Бел. Крыніцы").

У сьледстве Яйко прызнаўся да віны і заявіў, што яго намовіў да забойства агент паліцыі Станкевіч, цьвердзячы, што казаў яму гэта зрабіць камандант Дрэвінскі.

Судовая расправа віну абвінавачаных сьцьвердзіла. У выніку расправы 26 м. м. засуджаны: Яйко на 2 гады, Станкевіч на 2 з палавінай гадоў і кам. Дрэвінскі на 5 гадоў турмы.

Другі працэс, аб забойстве пасла Т. Голувкі, які пачаўся 19 мін. м-ца, так-жа гучным рэхам адбіваецца ня толькі ў Польшчы, але заграніцай. А ўсе газэты прыпісваюць сьмяротны акт у Трускаўцу, дзе забіты Т. Голувка, як акт тэрору таёмнай „Украінскай Вайсковай Арганізацыі."

Судзяць: Александра Бунія, Мікалая Мотыку і Рамана Бараноўскага. Акт абвінавачаньня абымае В. Біласа і Д. Данілышына, на якіх выканаены прысуд сьмерці даразнага суду ў Львове ў м-цы сьнежні мін. году, а дзеля гэтага сьледзтва проці іх спынена, а так-жа і М. Гнатава, які ўцёк заграніцу і дзеля гэтага сьледства супроць яго спынена.

Буній прызнаўся, што ў жніўні 1931 г., будучы порт'ерам у пэнсіонаце, дзе забіты Голувко, даў весткі аб прыбыцьці ў пэнсіонат Голувкі Мотыку і, што гаварыў аб гэтым з Біласам.

Мотыка заявіў, што арганізацыя не давала прыказу забіць Голувку, а гэта забойства зарганізаваў на ўласную руку Гнатаў.

Бараноўскі расказаў, што быў сябрам Арганізацыі Украінскіх Нацыяналістаў, а такжа і „ідэйным конфідэнтам паліцыі."

Судовы працэс працягнецца каля трох тыдняў.

Акцыя народнай пазыкі. Пасьля распісаньня нутранай народнай пазыкі, улады прыступілі да яе рэалізацыі. У першую чаргу падпісалі пазыку вышэйшыя ўрадаўцы ўсіх рэсортаў, а за імі і усе ўрадаўцы ніжэйшыя. Падпісалі так-жа купцы, гандляры і прамыслоўцы, падпісваюць і іншыя багацейшыя людзі. Пазыку гэту растэрміноўваюць на раты, каб мог выплаціцца і бяднейшы. Падпісалася ўжо даволі многа, куды больш, як было празначана, а празначана было на 120 мільёнаў зл.

З заграніцы.

Блёк чатырох дзяржаў у Лізе Народаў. У зьвязку з пачаткам сэсіі Лігі Народаў і нарадамі конфэрэнцыі дзеля разбраеньня, незвычайна ажывілася француская палітыка. Францускі ўрад спадзяецца, што тры дзяржавы блёку: Нямеччына, Італія і Англія выступяць у Лізе Народаў і на конфэрэнцыі разбраеньня салідарна з дамаганьнямі роўнапраўнасьці для Нямеччыны, а іменна: будуць дамагацца скасаваньня пунктаў вэрсальскага трактату, якія агранічваюць нямецкае збраеньне. Фактам ужо ёсьць, што Італія і Англія стаяць за тое, каб Нямеччыне пазволіць уваружыцца, а пасьля пачаць гутаркі аб агульным разбраеньні.

Францускі ўрад, каб разьбіць саюз Англіі з Нямеччынай, запрасіў у Парыж англійскіх і амэрыканскіх прадстаўнікоў ды паказаў дакуманты свайго генэральнага штабу аб тайным збраеньні Нямеччыны. Дакумантамі гэтымі францускі ўрад стараўся пераканаць амэрыканцаў і англійцаў, што Нямеччына пацішку зброіцца ўжо некалькі гадоў і мае страшныя газы, танкі, а так-жа ваенныя аэрапляны. і ўсё гэта пакіравана быццам супроць Францыі. Выкліканы польскі міністр заграніччых спраў Бэк, прыехаў у Парыж узяўшы з сабой дакументы, якія маюць даказаць, што Нямеччына гатовіцца да вайны і з Польшчай.

Усе гэтыя намаганьні праканаць Англію і змусіць Амэрыку выступіць супроць Нямеччыны, нічога аднак не асягнулі. Прадстаўнік Англіі Эдэн заявіў коратка: даволі блукацца ў цемнаце, трэба ўжо ставіць справу ясна і пазволіць Нямеччыне на тое, што яна заўтра можа ўзяць без дазволу. — Не ўдалося падобнае зрабіць Францыі і ў Рыме, дзе француская дыплёмацыя намагалася адцягнуць ад Нямеччыны Італію.

Словам, Францыі не ўдалося і калі 25 м. м. пачалася сэсія Лігі Народаў, стала справа пад знакам прызнаньня палітыкі блёку чатырох дзяржаў: Нямеччыны, Францыі, Англіі і Італіі. Аб гэтым афіцыяльна заявіў старшыня сэсіі Лігі ў сваей прамове, кажучы, што з задаваленьнем спатыкае блёк чатырох, які можа наладзіць роўнапраўнасьць і брацтва ў Эўропе.

Як пойдзе далей супрацоўніцтва блёку чатырох, пакажа будучыня. Вельмі магчыма, што Францыя выйдзе з гэтага блёку, дзе ёй не ўдаецца праводзіць сваей палітыкі. Гэта аднак залежыць у вялікай меры і ад таго, як уложацца справы палітыкі на лініі Парыж—Варшава—Масква. Ня выключана так-жа і супрацоўніцтва Францыі ў блёку, якое залежыць ад ставовішча Англіі і Нямеччыны, гварантуючага бясьпеку Польшчы і Францыі. У зьвязку з гэтым у Жэнэве адбываюцца загадковыя справы. Прадстаўнік Польшчы вядзе перагаворы з прадстаўнікамі Нямеччыны і Англіі.

Італьянска-нямецкая палітыка ў Эўропе. Італьянска-нямецкая палітыка ў Эўропе з кожным днём пасоўваецца ўперад. Нямеччына працуе ў поўнай згодзе з Італіяй. Імкненьні Італіі да стварэньня блёку наддунайскіх дзяржаў, асабліва да злучэньня Аўстрыі з Вугрыяй, ідуць пасьпешна наперад. Нямецкія гітлераўцы імкнуцца да злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай. Італія ўдавала, што змагаецца з гэтым нямецкім імкненьнем, праконваючы Эўропу, што адзіны ратунак прад злучэньнем Аўстрыі з Нямеччынай — гэта стварэньне Аўстрыйска-Вугарскай дзяржавы. Але і гэткі выхад не карысны для Францыі. Бо ці Аўстрыя злучыцца з Нямеччынай ці створыцца Аўстрыйска-Вугорская дзяржава, дык усё адно на гэтым скарыстае італьянска-нямецкая супалка. Усё гэта ведае Англія, ведае і Францыя, ды ведае і ўся Эўропа, што Нямеччына з Італіяй падзяліліся работай: Італія вядзе заграничную палітыку сваю і Нямеччыны. Англія, прыступаючы да пакту чатырох дзяржаў, знала загадзя аб італьянска-нямецкіх намерах і на гэта хіба-ж згадзілася. Англія зусім уступіла пад націскам лёгікі фактаў і ня думае хіба-ж падтрымліваць Францыі, бо ведае, што ўтрымаць дасюлешні стан немагчыма.

А цяпер Францыя: яна баіцца Італіі, баіцца і Нямеччыны. Дагэтуль Францыя мела пад сваімі ўплывамі Малую Антанту і Польшч, ды магла праконваць Англію, якая мала ўмешвалася ў справы Эўропы. Цяпер, калі на сусьветную арэну выйшла Італія, вырас пад бокам Францыі грозны працаўнік, які ўжо праконвае Англію супроць інтарэсаў Францыі. Стварылася новае палажэньне, у якім Францыя пабачыла супроць сябе Англію, Нямеччыну і Італію з меншымі дзяржавамі, як Аўстрыя, Мадзяршчына, Баўгарыя, Літва, Альбанія і Фінляндыя. Па старане Францыі асталася толькі Малая Антанта і Польшч. Францыя, пачуўшыся ў такім палажэньні, кінулася ўзмацоўваць свае ўплывы на ўсходзе Эўропы. У Маскву езьдзіў Эріо. Не астаецца ад Францыі і Польшч. Пачалі заключаць дагаворы з Саветамі і чуваць, што ў Саветы паедзе ў адведзіны і польскі марш. Я. Пілсудскі. Як бачым, палітычная ігра вялікая, а дн чаго яна давядзе, гадаць ня будзем.

Аружны напад на канцлера Аўстрыі. Дня 3 г. м. дакананы аружны напад на аўстрыйскага канцлера Дольфуса. Напад дакананы ў пямешканьні Венскага парляманту, дзе канцлер быў на паседжаньні хрысьціянска-грамадзкага клюбу. Калі Дольфус выходзіў з пакою паседжаньня клюбу, напасьнік выстраліў у яго з рэвальвэру два разы, адна куля трапіла ў грудзі, але адскочыла, а другая папала ў пляча і лёгка раніла. Напасьніка зараз-жа арыштавалі. Аказаўся ім б. жаўнер звольнены з службы за народна-соцыялістычную прапаганду.

Ліга Народаў аб народных меншасьцях. Сёлета — так-жа занялася справай народных меншасьцяў Ліга Народаў, але зьмяняць процэдуры для скаргаў меншасьцяў і ня думае. Гэтым разам падаў праект рэзалюцыі прад-

стаўнік Польшчы. Словам, палітыкуюць, але не работу робяць.

Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў і Жыды. Газэты падаюць, што ў апошніх днях верасьня Жыды выступілі з Выканаўчага Камітэту Кангрэсу Нацыянальных Меншасьцяў Эўропы. — Пры меўсцы трэба зазначыць, што жыдоўская дэлегацыя на сёл. Кангрэс Нац. Меншасьцяў у Бэрне дамагалася, каб Кангрэсам — бяз удзелу і зрэфэраваньня справы імі-ж, г. зн. жыдамі — вынес рэзалюцыю на карысьць жыдоў у сучасным нямецка-жыдоўскім споры. Кангрэс такой пастаноўкі справы ня прыняў і жыды, у тыдзень пасьля зачыненьня Кангрэсу, пастанавілі выйсьці з Выканаўчага Камітэту Кангрэсу.

Бальшавікі хочуць купіць прыязьнь Амэрыкі. Заграгнічныя газэты падаюць, што бальшавікі таргуюцца з амэрыканцамі аб прызнаньні Амэрыкай С.С.Р.Р. Бальшавікі згаджаюцца за прызнаньне іх праўнай уладай купіць у Амэрыцы за 150 міл. даляраў прадуктаў і скаціны, а нават плаціць царскія даўгі.

Трагэдыя Кубані. Паптаўская станіца лічыць 15 тысяч жыхароў. Камуністычная ўлада пастанавіла гэтых жыхароў перасяліць у іншыя краі С.С.Р.Р. яшчэ ў мінулым годзе. Прычына: непаслушнась савецкай уладзе.

Украінцы не даюць савецкай уладзе прадуктаў. Маскоўскія газэты наракаюць, што Украіна ня выконвае свайго забавязаньня. У мін. годзе да 10 жніўня было прыгатавана на Украіне для Маскоўшчыны 10 тысяч вагонаў прадуктаў, а сёлета толькі 4 з палавінай тысяч. Камуністычныя газэты дамагаюцца, каб савецкая ўлада рашуча вымагала ад Украіны выканаьня пляну.

З краю.

Жанчыны ня любяць сэктантаў. Надовячы каля вёскі Пруднікі, Маладэчанскага пав. у ставе меўся адбыцца „хрост" баптыстаў. Мелі „ахрысьціць" у баптызм 17 сялян. Зьявілася да „хросту" аднак толькі 4-х, але і гэтых „ахрысьціць" не ўдалося, бо зьбегліся з кіямі жанчыны і прагналі ад ставу баптыстаў.

Сумнае гэта зьявішча, што сэктанты „хрысьцяць" хрысьціян, а праваслаўнае і каталіцкае духавенства ў нашым краю займаецца: першае русыфікацыяй, а другое полёнізацыяй беларусаў.

Атруціўся дэнатуркай. У Красным над Ушай Я. Бурак, налаговы п'яніца напіўся дэнатуркі і ўжо не працьверазеў — памёр.

Забіў чалавека, каб не аддаць 3 зл. У Лідзкім акружным судзе адбылася судовая расправа за забойства. Судзілі Я. Тамашэвіча за забойства ў ліпні м-цы с. г. Зубрыцкага, каторы хацеў зыскаць ад Тамашэвіча 3 зл. Тамашэвіч забіў Зубрыцкага шавецкім малатком. Тамашэвіч засуджаны на 3 гады турмы.

Тыфус. У Дзісьненскім пав. паявілася зараза тыфусу. Лекары змагаюцца з гэтай заразай. Цяпер ува ўсім павеце ёсьць 7 асоб хворых на тыфус.

З ВІЛЬНІ.

Імяніны Мітр. Дзяніса. На дзень 3 кастрычніка с. г. прыпадалі Імяніны Мітрапаліта Дзяніса. Віл. Эпарх. Улада на некалькі дзён ужо перад тым шырака аб гэтым абвесьціла, заклікаючы верных да прыняцьця ўдзелу. Аднак, як гэта ня дзіўна, на ўрачысты малебен ў Сьв. Духавым Манастыры зьявіліся... амаль адны працаўнікі Віл Кансысторыі. Даслоўна — ня больш дзесяцёх чалавек. З беларусоў удзелу ў гэтым малебне ніхто ня ўзяў. Зьявішча гэнае даволі сумнае, бо сьведчыць аб тым, якой „популярнасьцю" карыстаецца сярод праваслаўных Галава Прав. Царквы, які падтрымоўваньнем маскоўшчыны адагнаў аб сябе беларусоў, ды ня вельмі прывабіў і іншых.

Тыфус. У апошніх часах пачалі ў Вільні хварэць людзі на брушны тыфус. Санітарныя ўлады намагаюцца зьліквідаваць гэту заразу.

Пратэсты вэксалёў. У м-цы жніўні с. г. запратэставана 4.327 вэксалёў на суму 1.127.476 зл., у м-цы верасьні — 4.226 вэксалёў на суму 994.658 зл.

Цана грошай. Даляр 5 зл. 68 гр. Залаты рубель 4 зл. 72 гр.

Да нас пішуць.

Здраднікаў пазналі.

Віл.-Троцкі павет. Хто чытае, ды яшчэ і выпісвае, „Беларускую Крыніцу" — гэта сьведамы беларус-незалежнік. Але вось сёлета, ні ссюль ні стуль, адрэсатам „Беларускай Крыніцы" пачала дарма прыходзіць і „Беларуская Газэта." Гэта газэціна зусім не беларуская, а толькі мае такі назоў. Ад першага нумару нашы сяляне пазналіся на перафарбаванай лісіцы—адразу пазналі, што гэтая нібы „Беларуская Газэта"—варожая ўсяму Беларускаму народу, бо варожая беларускаму нацыянальна — палітычнаму вызваленьню і эканамічна-гаспадарчаму адраджэньню. Не падабаецца рэдактару „Бел. Газэты", нейкаму Карповічу, каторага ніхто з беларусоў ня знае. ані змаганьне беларусоў за ьыцьцё народна-рэлігійнае, ані барацьба за лепшы быт эканамічна-гаспадарчы, не падабаецца народная прасьвета сярод беларусоў і ня любіць ён беларускай палітыкі. Паводле думкі Карповіча ў „Бел. Газэце", хай Беларусь, матка гаротных, ляжыць у гробе, а беларусы павінны гнуць пакорна сьпіну і гныбець, ды пры гэтым павінны яшчэ нявольо хваліць.

Гэта ўсё ясна відаць з „Бел. Газэты" і аб гэтым сяляне між сабой гавораць. Дык ня ўдасца Карповічу затруціць здаровы наш сялянскі розум мэтадам уцякаючага злодзея, які ўцякаючы крычыць „лавіце злодзея!" На крык „Бел. Газэты," што „хадэкі-здраднікі", сяляне адказваюць—„здраднік Карповіч і ўся яго газэта адна здрада." Позна ўзяўся Карповіч мыліць вочы беларусам, якія ўжо адрозьніваюць куколь ад пшаніцы. Ужо беларускія сяляне ведаюць, што няма адкуль чакаць на лепшую долю без эканамічна-гаспадарчай самастойнасьці, да якой імкнецца нялюбае „Бел. Газэце" незалежнае беларускае грамадзянства, згуртаванае пад сьцягам Беларускага Нацыянальнага Камітэту і выяўляючае свае імкненьні ў «Бел. Крыніцы," „Самапомачы" і „Шляху Моладзі.» Аб беларускім Нац. Камітэце і падпарадкаванай яму „Бел. Хр. Дэм." (Б.Х.Д.) сяляне добра ведаюць і поўна даваряюць, бо ведаюць аб'яўленую праграму БХД, якая бароніць інтарэсы беларускіх сялян і работнікаў. А дзе-ж хто чытаў або бачыў праграму Карповіча ці „ягонай» „Бел. Газэты»? Хто ведае, якія ідэалы хоча асягнуць гэты пан праз „Бел. Газэту"? Ці ня будуць тут ідэалам юдавыя срэбнікі?

Дык вось дзеля гэтага ўсяго нашы сяляне гоняць вон нахала—„Бел. Газэту," якая бяз просу лезе ў сялянскую хату.

Можа Карповіч задумае яшчэ пярэчыць гэтаму ў „Бел. Газэце," дык наступным разам пакажу і факты.

Я. Ярмалковіч.

Як заснавалі „стшэльца".

Верашычы, Наваградзкага пав. Тыдняў пару таму, дзякуючы спрытнай намове польскага вучыцеля, верашыцкія хлопцы (на шчасьце ня ўсе) згадзіліся, каб у нашай вёсцы быў заснаваны „strzelec." Якім чынам гэта сталася? Вельмі проста. Пан кіраўнік у гарача-патрыятычнай прамове выявіў усе карысьці для тых, хто ўпішыцца ў „стшэльца," а найменна: кожнаму „стшэльцу" будзе добра ў войску, што дадуць зьніжкі на чыгунку і да гэтага (галоўнае) аж па 1 зл. на месяц на ваксу да ботаў.

Убачыўшы ў памяці гэтыя ўсе прынады нават найсьведамейшыя з верашыцкіх хлапцоў... згадзіліся. Праўда, былі і такія, што не пайшлі на вудачку (як напр. Мікалай Анішчык і інш...), аднак „стшэлец" ў чыста-беларускай вёсцы заснаваўся.

Сорамна, хлопцы! Закладайце свае беларускія арганізацыі—Бел. Інстытут Гасп. і Культуры або Т-ва Бел. Школы, якія ў нашых вёсках, сапраўды патрэбны.

І Вам сорамна, польскія настаўнікі: — прыпомніце, як вас вынарадаўлялі расейцы, ды немцы.

Дратва.

Адзін факт з многіх.

Валяўка, Наваградзкага пав. З год таму назад быў у Валяўскім прыходзе айцец Ральцэвіч, які не хацеў хаваць памёршых, але цяпер прыслалі другога: айца Бірюка.

Думалі сяляне, што ўжо дачакаліся добрага сьвяшчэньніка, ажно гдзе там!... (гэткі самы русафіл—беларусаед, як і той першы).

Калі жанчына ня дасьць гэтулькі грошай ці яец, колькі ён загадае, дык ня выспавядае! А 24.ІХ.33 г. здарыўся і гэткі выпадак: прыйшла жанчына ў царкву ўводзіцца з дзіцём (на 40 дзень пасьля радзін). Наш „батюшка" кажа: „дай паўзлота, тады ўвяду." Жанчына дастала 40 гр. ды просіцца. каб за гэтыя ўвёў, бо больш няма. Але дзе там: поп і гаварыць ня даўся. Тады жанчына кажа: „можна ўваходзіць за грошы, дык можна й бяз грошай" — і ўвайшла сама.

Гэткіх фактаў ёсьць ня мала. А трэба ведаць, што а. Бірюк мае толькі адну дачку, мае камяніцу ў м. Дзятлаве, атрымлівае эмэрытуру (былы інспэктар) і да таго-ж лупіць з людзей, як можа: пагнаўся на 10 грошай. І сораму ніякага ня мае! Вось дык „сеятель русской культуры" і „апора" хрысьціянства!

Няўжо-ж валяўскія прыхаджане не дачакаюцца свайго сьвяшчэньніка-беларуса, які сапраўды меў-бы якуюсь ідэовасьць у сваіх чынах?

Прыхаджанін.

Крыўдная комасацыя.

Руда, каля Постава. У нашай вёсцы цяпер зрабілі хутары — правялі комасацыю. Мераў зямлю і вырэзваў хутары прыватны каморнік Зубкоў. Комасацыя зусім не ўдалася. Некаторыя сяляне надта пакрыўджаны. Выйшла так, што адным паадрэзалі кавалкі зямлі, а другім прырэзалі. Прыкладам С. Вераб'ю за 6 з палавінай дзесяцін вырэзалі хутару 2 з палавінай дзесяцін. А гэта не аднаму толькі Верабʼю так выпала.Гэтыя пакрыўджаныя комасацыяй сяляне ня ведаюць, што цяпер і рабіць: ці выракацца зямлі ці шукаць справядлівасьці. Можа ў гэтай справе нашым сялянам штось парадзіць рэдакцыя „Бел. Крыніцы."

Рудаўскі.

АД РЭДАКЦЫІ: Пакрыўджаныя ўсе разам могуць заскаржыць выкананьне комасацыі Акружному Зямельнаму Камісару з просьбай разсьледаваць справу і правядзеньня паноўнага памеру і падзелу. Калі-ж былі надужыцьці, дык адначасна трэба заскаржыць і пракурору акружнога суду.

Адказ для ўсіх у справе „Беларускай Газэты."

Наша рэдакцыя атрымлівае пісьмы з просьбай выясьненьня аб „Беларускай Газэце," якая бяз просу рассылаецца па ўсей Зах. Беларусі. Шкода мейсца і часу шмат аб гэтым пытаньні тут разводзіцца. Адказваем коратка:

1) «Беларуская Газэта," кажучы проста, гэта байстручок бальшавіцка-польскага флірту.

2) Рэдактар „Беларускай Газэты" Карповіч сярод беларусоў чалавек няведамы і ні да якой беларускай арганізацыі не належыць.

3) Арыентацыя «Беларускай Газэты:" бальшавіцка-польскае паразуменьне.

4) Ідэолёгія „Беларускай Газэты:" зьнішчыць усё народна-беларускае і забіць у беларускім народзе нацыянальнае пачуцьцё, а так-жа не дапусьціць беларускае сялянства да эканамічна-гаспадарчай арганізацыі, каб яно не пабагацела, бо бяднейшае і неарганізаванае — пакарнейшае і слабейшае да „кіраваньня."

5) Мэта „Беларускай Газэты:" замацаваць на заўсёды сучаснае палітычнае палажэньне Беларусі.

Рэдакцыя „Бел. Крыніцы."

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.